**Вольга Самусевіч**
**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

# КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫЯ МАЎЛЕНЧАЙ РЭЧАІСНАСЦІ: канцэпт *грошы* ў лагасферы беларускіх СМІ

Разам з дэмакратычнымі зрухамі як праявамі новай хвалі адраджэння адбываюцца ў жыцці беларускага грамадства і разбуральныя працэсы, якія правакуюць духоўную і маральную дэградацыю. Пад моцным прэсам аўдыёвізуальнай маскультуры фарміруецца пакаленне людзей, для якіх, як слушна заўважае Я. Крук, “шкала каштоўнасцяў зведзена да дзвюх вызначаных велічынь: культу сілы і грошай” [1, с. 3]. Ва ўмовах такой сацыякультурнай сітуацыі ўзнікла неабходнасць вызначэння жыццёвых прыярытэтаў, глыбокага асэнсавання агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцяў.

Беларусам спрадвеку было ўласціва прагматычнае стаўленне да жыцця. Грошы ніколі не былі каштоўнасцю. Зразумела, «*без шчасця не будзе багацця, а за грошы шчасця не купіш*». Аднак беларусы ставіліся да грошай як да жыццёвай неабходнасці, з горкай іроніяй сцвярджаючы, што «*праўда ў тых, хто грошы мае*». Падобнае асэнсаванне мы бачым і ў газеце «Наша Ніва»: “*Мусіш усе сілы накіраваць на тое, каб хаця палепшыць гаспадарку. Але на гэта, апроч знаньня, навукі, патрэбны грошы: хаця зямелька іх верне з лішкам, дык жэ часта німа скуль пазычыць іх*” (1908. 18 грудня), “*Без грошэй на аблізаным куску і самаму разумнаму і вучонаму чалавеку цяжка што-небудзь зрабіць*” (1908. 11 сенц.).

Сучасныя СМІ семантычна пашырылі, сэнсава «ўзбагацілі» гэтае паняцце і вывелі яго значэнне за межы, вызначаныя тлумачальным слоўнікам. Прагматычны падыход да жыцця ў цяперашні час выліўся ў прагу да

грошай. "*Пришли новые времена – другие отношения между людьми. Если за свои услуги не получать деньги, то будешь жить хуже других. Такой прагматический подход к жизни будет прогрессировать и дальше*". Перыядычны друк класіфікуе *грошы* па розных якасцях. ***Грошы**: жывыя, абстрактныя, рэальныя, лішнія – нялішнія, дастойныя, чыстыя, горкія, дурныя, фальшывыя, злачынныя, брудныя, народныя, нацыянальныя, "зверскія", экалагічныя, грабавыя, чарнобыльскія, бацькоўскія, калгасныя, п'яныя, настаўніцкія, малочныя* і інш. ***Грошы**: грашовы знак, валюта, беларускі рубель, "зайчыкі", "бабкі", "баксы", "капейкі", нікчэмны метал, гарэлка, зерне, авіямілі* і інш. У кожным перыядычным выданні "грашовыя" маўленчыя формулы кшталту *ўмацаванне курса беларускага рубля, жорсткая грашова-крэдытная палітыка, попыт на валюту, грашовая маса, рублёвыя дэпазіты, наяўныя грошы, продаж валюты* займаюць дамінуючыя пазіцыі, што звязана з важнасцю эканамічных пытанняў для краіны.

Кардынальна змяняюцца ў друку адносіны да грошай. "Зараз, калі няма грошай, дык ты не чалавек". Як слушна сцвярджае адна з газет, у соцыуме адбываецца дэвальвацыя духоўных каштоўнасцяў: "…пры выбары "тавар ці малітва" аддадуць перавагу першаму". У сучасным масава-інфармацыйным дыскурсе актуалізуецца пытанне "спекуляцыі" каштоўнасцямі, разглядаецца праблема бездухоўнасці сучаснага грамадства. *Грошы* ў савецкія часы "культивировались *как некое зло...* Сегодня с точностью до наоборот. То есть деньги, вроде бы, тоже остаются злом. Но при этом злом вожделенным». Аднак гэта прагнасць культывуецца як эталон пасяховага і шчаслівага жыцця. Традыцыйная асацыятыўная сувязь *грошы – праца* толькі часам рэалізуецца на старонках друку: "Як ні дзіўна, але даволі папулярным сродкам заробку грошай застаецца сумленная праца на карысць сабе і людзям".

Духоўныя каштоўнасці – *любоў, спагада, дабрыня* – ніколі не асацыяваліся з паняццем *грошы*, але лічыліся *багаццем* чалавека. На старонках сучасных СМІ чытаем: "Большая любовь стоит больших денег". Адкрыта прапагандуецца новы ідэал – *чалавек з грашамі*, бо той, хто імі валодае – валодае сілай, уладай і правам, і гэта вербалізуецца ў маўленчых формулах "*сила в деньгах*", "*всё решают деньги*", "*кто платит, тот и прав*" і інш. У сучасным грамадстве гршы не толькі фактар сацыяльнай дыферэнцыяцыі, але своеасаблівы сродак пакарання: "*Если и надо кого-то наказывать, то лучше "рублём". Это наиболее действенно и цивилизованно. И доходит быстрее*". Менавіта ў век камерцыялізацыі грошы

вызначаюць кошт усяго. У дыскурсе СМІ з’яўляюцца новыя семантычныя ланцужкі: *грошы – культура*, *грошы – школа*, *грошы – зямля, грошы – прырода*. (Параўн.: “*Без денег наша культура, как машина без бензина*”; “*Школы будуць вучыць, выхоўваць – і зарабляць грошы*”; “*Зямля любіць грошы*”; “*Ценить природу наряду с деньгами*”).

Перыядычны друк, які валодае дастатковым патэнцыялам уздзеяння на грамадскую свядомасць, аднаўляючы страчаныя каштоўнасці і сцвярджаючы новыя, павінен дакладна размяжоўваць духоўныя і матэрыяльныя каштоўнасці, аддаючы перавагу ўсё ж такі першым.

**Літаратура**

1. Крук Я. Следам за сонцам: беларускі народны каляндар. – Мн., 1998.